УДК 902/904

# ШМАТКУЛЬТУРНЫ ПОМНІК СТЫТЫЧАВА-1 КАЛЯ ПІНСКА ПА ВЫНІКАХ АРХЕАЛАГІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ 2024 Г.

**А.Ф. Касюк[1], А.Д. Гаршкоў[2]**
[1]Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей, kasiuk2585@gmail.com
[2]Гродзенскі дзяржаўны ўніверстітэт імя Янкі Купалы, ales.harshkou.arch@gmail.com

**Анатацыя.** Дадзены артыкул прысвечаны вынікам археалагічных даследаванняў, якія былі праведзены аўтарамі ў 2024 г. на помніку Стытычава-1 Пінскага раёна Брэсцкай вобласці. Прадстаўлены аналіз атрыманых матэрыялаў, іх культурна-храналагічная інтэрпрэтацыя і вызначана месца помніка Стытычава-1 сярод паселішчаў з матэрыяламі рымскага перыяду на тэрыторыі Пінскага раёна.

**Ключавыя словы:** археалогія, паселішча, крэмень, кераміка, праселка, рымскі перыяд, зарубінецкая культура, вельбарская культура.

**Уводзіны.** Улетку 2024 г. аўтарамі артыкула былі праведзены археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Пінскага раёна Брэсцкай вобласці. Працы былі сканцэнтраваныя на далейшым вывучэнні помніка з культурнымі напластаваннямі розных перыядаў Стытычава-1, які быў выяўлены ў 2022 г [2].

Мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца ўвядзенне ў навуковы зварот калекцыі матэрыялаў, атрыманай на помніку Стытычава-1 у 2024 г.

**Асноўная частка.** Паселішча Стытычава 1 размяшчаецца каля в. Стытычава (Плешчыцкі с/с), на беразе р. Ступа (правы прыток р. Піна), на пясчаным узвышэнні памерамі 130 х 200 м. Помнік пашкоджаны ветравой эрозіяй, паверхня слаба задзернаваная. Культурны пласт прадстаўлены пяском светлага жоўта-шэрага колеру. Падчас агляду помніка ў 2022 г. і праведзеных паверхневых збораў, была атрымана калекцыя артэфактаў з 140 адзінак, на падставе аналізу якой было ўстаноўлена, што дадзеная тэрыторыя была заселена ў каменным (эпоха неаліту) – бронзавым вяках, раннім жалезным веку. Актыўным было жыццё на помніку ў рымскі перыяд, аб чым сведчаць шматлікія знаходкі фрагментаў ляпных пасудзін, а таксама шкляной пацеркі. І ў Новы час тэрыторыя помніка Стытычава-1 была заселена.

Даследаванні на паселішчы Стытычава-1 у 2024 г. таксама праходзілі ў форме збору пад’ёмнага матэрыялу. Практычна ўся яго тэрыторыя ўяўляе сабой вялікі пясчаны раздуў з незадзірваненай паверхняй, на асобных ускрайках вядзецца сельскагаспадарчая дзейнасць. З мэтай большай дакладнасці фіксацыі артэфактаў тэрыторыя помніка была падзелена намі на ўмоўныя зоны “1”, “2” і “3”, у межах якіх матэрыялы збіраліся асобна. Індывідуальныя знаходкі і скапленні артэфактаў фіксаваліся з дапамогай GPS навігатара.

Па выніках паверхневых збораў, праведзеных на помніку Стытычава-1 была атрымана калекцыя артэфактаў са 197 адзінак. Крамянёвыя матэрыялы прадстаўлены 81 адзінкай. Сярод іх: прэнуклеус, 2 нуклеуса шматпляцовачных ад адшчэпаў біпалярных, моцнаспрацаваны нуклеус аднапляцовачны ад пласцін і адшчэпаў, нуклеус шматпляцовачны ад адшчэпаў з біпалярнай тэхнікай расшчаплення, нуклеус шматпляцовачны ад адшчэпаў, рэшткавы фрагмент нуклеуса шматпляцовачнага ад адшчэпаў з біпалярнай тэхнікай, 3 рэшткавыя фрагменты нуклеусаў, скол аднаўлення пляцоўкі нуклеуса, адыход вытворчасці наканечніка, нарыхтоўка біфасіяльнай прылады, пракрутка, скрабач, фрагмент скрабка, 2 трапецыі (на адшчэпах), адыстальная пласціна падскарыністая, адыстальная падрабрыстая пласціна, праксімальная частка пласціны, пласціна падскарыністая, адыстальная пласціна двухпляцовачная, 5 адшчэпаў рэтушаваных, 7 адшчэпаў, адшчэп скарыністы, 6 адшчэпаў падскарыністых (1 – з тэрмічным уздзеяннем), адшчэп рэтушаваны скарыністы, 10 адшчэпаў рэтушаваных падскарыністых, фрагмент адшчэпа рэтушаванага, 2 фрагменты адшчэпаў рэтушаваных падскарыністых, фрагмент адшчэпа падскарыністага, 3 фраг-

менты адшчэпаў (2 – з тэрмічным уздзеяннем), 16 лускавінак, лускавінка падскарыністая, абломак крэменю, фрагмент жаўлака, 2 адбойніка (?).

Фрагментаў ляпных пасудзін выяўлена 100 адзінак. У калекцыі прысутнічае кераміка (у асноўным – сценкі пасудзін, часткова, з вельмі гладкай паверхняй), якая датуецца неалітам – бронзавым векам. Венца пасудзіны са штампаваным арнаментам (мал. 1: 1) суадносіцца з матэрыяламі культуры шнуравой керамікі [3]. Венцы і сценкі пасудзін з характэрнымі акруглымі адтулінамі (мал. 1: *2-3, 5*), аднесены намі да позняга бронзавага – ранняга жалезнага веку (мілаградская культура?). Падобная кераміка была выяўлена і ў 2022 г.

Глінянае праселка з падлошчанай паверхняй (мал. 1: 14), а таксама венцы пасудзін з лошчанай паверхняй (мал. 1: 4, 11), венца пасудзіны з шурпатай паверхняй (мал. 1: 12), сценкі пасудзін з лошчанай паверхняй чорнага колеру (мал. 1: 8-9), сценка пасудзіны з валікам (мал. 1: 13), донца пасудзіны з падлошчанай паверхняй (мал. 1: *10*), дэкаратыўны элемент (?) ляпной пасудзіны (мал. 1: 6), фрагмент гліянага дыска (мал. 1: 7) і шматлікія сценкі пасудзін шурпатыя, з лошчанай і падлошчанай паверхнямі і дамешкай дробнай жарствы і шамоту ў цесце звязаны з насельніцтвам паселішча Стытычава-1 у рымскі перыяд. У гэты час на тэрыторыі сучаснага Пінскага раёна пражывалі прадстаўнікі зарубінецкай культуры, а пасля – постзарубінецкага гарызонту і вельбарскай культуры [1].




**Малюнак – Археалагічныя матэрыялы, выяўленыя на помніку Стытычава-1 у 2024 г.**

Таксама ў калекцыі 2024 г. з помніка Стытычава-1 прысутнічаюць каменныя прылады і іх фрагменты, якія, меркавана, выкарыстоўваліся для расціранння і загладжвання. Была знойдзена аснова "зерняцёркі", якая мае адну ўвагнутую паверхню і другую – пляскатую, вельмі гладкую (мал. 1: 18). Храналогія каменных прыладаў з паверхневых збораў не можа быць вызначана дакладна, таму яны датуюцца шырока – ад неаліту да рымскага перыяду. Таксама на паверхні паселішча зафіксавана вялікая колькасць кругавой керамікі Новага часу (мал. 1: 15-17).

**Высновы.** Такім чынам, вынікі археалагічных даследаванняў на помніку Стытычава-1 дазволілі ўдакладніць яго культурна-храналагічную ідэнтыфікацыю, высветліць межы паселішча і вызначыць месцы скапленняў матэрыялаў – сляды пашкоджаных аб'ектаў, якія варта вывучаць у будучым.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Белявец, В.Г. Стан і актуальныя праблемы вывучэння помнікаў постзарубінецкага гарызонту ў Беларускім Палессі. Насельніцтва вельбарскай культуры ў гісторыка-культурным развіцці тэрыторыі Беларусі рубяжа II/III – пачатку V ст. н.э. / В.Г. Белявец // Славяне на территории Беларуси в догосударственный период : к 95-летию со дня рождения Леонида Давыдовича Поболя. В 2 кн. Кн. 1 / О. Н. Левко [и др.] ; науч. ред.: О. Н. Левко, В. Г. Белевец ; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – 2-е изд., испр., перераб. и доп. – Минск : Беларуская навука, 2019. – С. 345–461.

2. Касюк, А.Ф. Вынікі археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Пінскага раёна Брэсцкай вобласці ў 2022 годзе / А.Ф. Касюк // Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе : сб. научн. Ст. / Полес. Гос. ун-т ; под ред. В.И. Дуная, Р.Б. Гагуа и др. – Пинск : ПолесГУ, 2023. – Вып. 8. – С. 22–26.

3. Крывальцэвіч, М.М. Цэнтральнаеўрапейскія традыцыі ў культуры Беларускага Палесся III–II тыс. да н.э. (паводле археалагічных даследаванняў) / Крывальцэвіч М.М. // Белорусское Полесье как историко-культурный феномен: материалы Международного научного семинара (Пинск, 29 мая 2019 г.) / Сост.: Л.А. Авгуль, Д.И. Бакун. – Минск: Центральная научная библиотека НАН Беларуси; Москва: ФГБУ науки Научный и издательский центр «Наука» РАН, 2019. – 172 с. – С. 99–107.